# Нашы юбіляры

## ІОСІФ АЛЯКСАНДРАВІЧ ЮХО



Споўнілася 70 гадоў доктару юрыдычных навук, прафесару кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Іосіфу Аляксандравічу Юхо.

Нарадзіўся І. А. Юхо ў сялянскай сям'і, якая жыла ў Мінску. У 1938 г. ён — студэнт Беларускага палітэхнічнага інстытута. Вялікую Айчынную вайну сустрэў курсантам Горкаўскага вучылішча зенітнай артылерыі. З кастрычніка 1941 г. і да апошніх дзён вайны знаходзіўся на фронце, некалькі разоў быў паранены. Перамогу сустрэў камбатам зенітнага дывізіёна.

Пасля дэмабілізацыі, у 1946 г., паступіў у Мінскі юрыдычны інстытут. Скончыўшы яго, працаваў народным суддзёй. У 1951 г. быў залічаны ў аспірантуру Інстытута філасофіі і права АН БССР. Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі застаўся працаваць тут навуковым супрацоўнікам.

З 1958 г. лёс Іосіфа Аляксандравіча непарыўна звязаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. І. Леніна. Спачатку ён быў залічаны дацэнтам юрыдычнага факультэта, затым некалькі гадоў працаваў загадчыкам кафедры гісторыі дзяржавы і права, затым намеснікам дэкана факультэта. У 1980 г. абараніў доктарскую дысертацыю, а ў 1982 г. выбраны прафесарам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

Навуковыя інтарэсы І. А. Юхо звязаны з даследаваннем гісторыі беларускага народа, яго дзяржаўнасці, прававых Інстытутаў, палітычных устаноў феадальнага часу. У выніку гэтых даследаванняў ім падрыхтавана і надрукавана звыш 100 навуковых работ, у тым ліку: «Прававое становішча насельніцтва Беларусі ў XVI ст.» (1978); «Статуты Вялікага княства Літоўскага» (1966); «Грамадскія і прававыя погляды Скарыны» (1967); «Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай» (1972); «За нашу і вашу вольнасць» (1989). Іосіф Аляксандравіч з'яўляецца адным з аўтараў і перакладчыкаў энцыклапедычнага выдання «Статут Великого княжества Литовского 1588 года. Тексты. Справочник. Комментарии» (1989). Вынікі яго даследаванняў увайшлі ў навуковы абіход, іх выкарыстоўваюць многія беларускія вучоныя, гісторыкі і юрысты.

І. А. Юхо аддае шмат творчых сіл, душэўнай цеплыні справе падрыхтоўкі высокаадукаваных юрыстаў. Акрамя вялікага педагагічнага таленту, ён валодае талентам добразычлівасці і павагі, спагадлівасці да кожнага чалавека. Працавітасць, сціпласць, памяркоўнасць здабылі Іосіфу Аляксандравічу аўтарытэт і вялікую павагу сярод студэнтаў і супрацоўнікаў юрыдычнага факультэта і універсітэта. Многія з яго вучняў абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

І. А. Юхо актыўна ўдзельнічае ў грамадскім і палітычным жыцці універсітэта, рэспублікі. З'яўляецца адным з ініцыятараў стварэння, членам рэдакцыйнага савета і адным з самых актыўных аўтараў часопіса «Спадчына». Неаднойчы выбіраўся ў склад партыйнага бюро і прафсаюзных органаў факультэта.

За баявыя і працоўныя заслугі Іосіф Аляксандравіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, чатырма медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Сваё 70-годдзе прафесар І. А. Юхо сустрэў у росквіце творчых сіл. У выдавецтве «Беларусь» выходзіць яго кніга «Крыніцы беларуска-літоўскага права», яшчэ адна кніга з нарысамі па гісторыі дзяржавы і права Беларусі рыхтуецца да друку.

Калектыў кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, студэнты і супрацоўнікі юрыдычнага факультэта жадаюць Іосіфу Аляксандравічу моцнага здароў'я, шчасця і поспехаў у ажыццяўленні ўсіх творчых задумак.

**Т. І. Доўнар**